ликация онлайн. В тоже время, охват аудитории в печатной инфографике намного меньше. Если небольшой процент аудитории доступен через оффлайн-средства, то такой инструмент публикации не будет эффективным вариантом. Как правило, оффлайн-публикация имеет смысл при использовании инфографики в общении с внутренней аудиторией, на днях открытых дверей и других мероприятиях для абитуриентов.

УДК 655.4/.5:7(476)

Студ. Круковіч І. В.
Навук. кір. дац. Куліковіч У. І.
(кафедра рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій, БДТУ)

# ВЫДАВЕЦКІ ПРАЕКТ «МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ XX СТАГОДДЗЯ. ВІЦЕБСКАЯ ШКОЛА»: АД ІДЭІ ДА РЭАЛІЗАЦЫІ

**Уводзіны.** У красавіку 2017 года рэалізаваўся выдавецкі праект “Мастацтва Беларусі XX стагоддзя. Віцебская школа”. Яго складнікамі сталі: кніга для дзяцей, настольная гульня “Мэмарыз”, паштоўка і электронна-метадычная крыніца. Разглядаемы выдавецкі праект зладзіўся як дадатак да курса заняткаў па мастацтвазнаўству для дзіцячых творчых майстэрняў, што праводзяцца пры галерэі сучаснага беларускага мастацтва “Ў”.

***Стварэнне ідэі выдавецкага праекта. ДТМ.*** Напрацягу 4-х год пры мінскай галерэі сучаснага мастацтва “Ў” ладзяцца “Дзіцячыя творчыя майстэрні”. ДТМ – гэта заняткі па сусветнаму і беларускаму мастацтвазнаўству для дзяцей 7-13 год. Стваральнікамі праекта з’яўляюцца: Сафія Садоўская (мастацтвазнаўца), Базыль (сучасны беларускі мастак), Ірына Лукашэнка (каардынатар), Вольга Мажэльская (асістэнт каардынатара). На занятках адбываецца знаёмства дзяцей з беларускім мастацтвам у кантэксце сусветнага.

***Канцэпцыя “Віцебскай школы”.*** Ідэйнай асновай дадзенага выдавецкага праекта з’яўляецца канцэпцыя “Віцебскай школы”, у якую уваходзяць наступныя мастакі: Казімір Малевіч, Марк Шагал, Алеся Паслядовіч, Уладзімір Цэслер, Генадзь Хацкевіч, Людміла Русава, Руслан Вашкевіч. Вышэйпералічаныя імёны – гэта прадстаўнікі культурніцкіх падзей Віцебска і мастакі, творчасць якіх адлюстроўвае ўплыў гэтых прадстаўнікоў.

**Задача даследавання –** прадэманстраваць вопыт удалай рэалізацыі выдавецкага праекта для дзяцей праз адлюстраванне этапаў рэдакцыйна-выдавецкага працэсу ў сучаснай выдавецкай справе.

**Інавацыйнасць праекта.** Мадуляцыя канцэпцыі "Віцебскай школы", прыдуманая стваральнікамі ДТМ-а, мае інавацыйны складнік, што абумоўлены крэатыўнасцю ідэі і яе навізной. Па-першае, канцэпцыя "Віцебскай школы" абсалютна новая для тэорыі беларускага мастацтва, па-другое, асноўны складнік дадзенага выдавецкага праекта – кніга "Мастацтва Беларусі XX стагоддзя. Віцебская школа", з'яўляецца першай інфармацыйнай крыніцай па сучаснаму беларускаму мастацтву для дзяцей.

**Класіфікацыя выдавецкага праекта.** Класіфікацыя дадзенага выдавецкага праекта была здейснена кіруючыся дысертацыяй Марыны Ганавай [1]. Паводле *тыпа па суб'екце дзейнасці* праект з'яўляецца *аўтарскім*, бо правоў на інтэлектуальную ўласнасць выдавецтву не перадавалася, то бок апрацоўка тэкставай ды візуальнай інфармацыі выконвалася каардынатарамі праекта, непасрэдна рэдактарам А. Глобусам і мастацкім рэдактарам Базылём. Паводле *састава і структуры* праект можна назваць *монапраектам,* бо ён складаецца з камплета неперыядычных выданняў. Паводле *прыроды асноўнай інфармацыі* праект з'яўляецца *крос-медыйным*, бо падчас рэкламнай кампаніі выкарыстоўваліся сацыяльныя сеткі, дзе была размешчана старонка выдавецкага праекта. На ёй размяшчалася інфармацыя пра складнікі праекта, анонс прэзентацый і рэкламных мерапрыемтсваў, відэа-інтэрв'ю з рэдактарам, дызайнерам, карэктарам і аўтарамі кнігі, а таксама ладзіліся прамыя трансляцыі рэкламных мерапрыемстваў у такіх публічных прасторах, як "Сон Гогаля", "Кніжная Шафа" У рэкламных мэтах ладзілася супрацоўніцтва з электроннымі СМІ шляхам стварэння артыкула на наступныя электронныя крыніцы: 34 multimedia magazine, Будзьма, City Dog, SVABODA.ORG, VITEBSK4.ME, culturepartnership.eu, odb-office.eu, kultprosvet.by, TUT.BY. Таксама адным з кампанентаў выдавецкага праекта з'яўляецца электроннае метадычнае выданне з методыкай правядзення заняткаў для дзяцей, якое будзе ў агульным доступе (зараз яно знаходзіцца ў карэктара). Паводле ступені арыгінальнасці зместа і паліграфічнага выканання праект *аўтэнтычны*, бо з'яўляецца прадуктам самастойнай творчасці стваральнікаў.

**Этапы рэдакцыйна-выдавецкага працэсу.** Рэдакцыйна-выдавецкі працэс увасаблення дадзенага праекта складаецца з пяці этапаў: падрыхтоўчы, рэдакцыйны, сродказбіральны, вытворчы, заключны. Падчас *падрыхтоўчага* этапа каманда распрацоўвала канцэпцыю праекта з выкарыстаннем прыёма пашырэння чытацкай аўдыторыі ды прываблівання пакупнікоў праз супрацоўніцтва са

знакамітымі медыйнымі асобамі і сучаснымі пісменнікамі, паэтамі: В. Акудовіч, А. Глобус, Г. Кісліцына, А. Хадановіч, Л. Вольскі.

Па словах каардынатараў праекта адным з адказных этапаў быў выбар рэдактара для кнігі. Ім стаў сучасны пісьменнік ды мастак А. Глобус, які асабіста знаёмы з амаль усімі разглядаемымі мастакамі кнігі, а таксама меў вопыт выкладання дзецям.

*Сродказбіральны* этап звязаны з размяшчэннем праекта на электроннай краўдфандынгавай платформе ulej.by. Краўдфандынг – гэта дазволены юрыдычна інструмент калектыўнага фінансавання праектаў ды ініцыятыў. У «краўдфандынгу» вялікая колькасць людзей падтрымлівае цікавы праект магчымай сумай, атрымоўваючы ўзаемны вынік пасля рэалізацыі праекта. Каардынатары вызначаюць суму, што неабходна для рэалізацыі праекта, а таксама тэрмін збора сродкаў. Калі праект не збікае вызначаную суму, грошы ў поўным аб'ёме вяртаюцца спонсару. На дадзенай платформе стваральнікі размясцілі буктрэйлер, інфармацыю пра праект, а таксама неабходную суму для яго рэалізацыі (сума складала 6 000 BYN, талака ж назбірала 108% неабходнай сумы ці 6 460 BYN).

*Вытворчы* этап – гэта этап матэрэалізацыі праекта. Кніга з'явілася ў выдавецтве "Логвінаў", якое цесна супрацоўнічае з галерэяй сучаснага мастацтва "Ў". Друк здзяйсняўся за мяжой (Вільня): BALTO print. Аддрукоўка фірмовых паштовак здзейснілася ў беларускай майстэрні высокага друку PAPERA PRESS. Майстры Ягор Гарай ды Тарас Куба сталі даволі папулярнымі зараз, бо ўдала працуюць з тэхнікай высокага друку, выкарыстоўваючы рэарэтэтную нямецукю машыну Korrex Stuttgart 1968 года выпуска. Майстэрня вельмі папулярная, бо пераважная колькасць беларускіх брэндаў замаўляе ў яе візітоўкі ды сертыфікаты.

*Заключным* этапам стаў распаўсюд кампанентаў праекта і праця яго рэкламнай кампаніі праз узаемадзеенне з патэнцыйнымі спажыўцамі – гэта ўдзельнікі талакі, якая збіраза грошы на рэалізацыю праекта, і ўсімі зацікаўленымі.

**Высновы.** У сучасным сусветным і беларускім кнігавыданні галоўную рэалізацыйную ролю грае камунікацыйны абмен інфармацыяй са спажыўцом, які здзяйсняецца праз узаемадзеянні ў розных формах: персанальнае (дыялог каардынатара – спажыўца адбываецца на прэзентацыі, аўтографсесіі), інтэрнэт (спажывец уступае ў кантакт з каардынатарам праз каментары ды чытанне старонкі праета, чытанне артыкулаў на электронных рэсурсах, непрысутнае назіранне за прэзентацыяй праз лайв-трансляцыю). Усе спосабы абмена інфармацыяй

ў ланцужку зацікаўлены – каарыданат праекта выконваюць камунікацыйную функцыю з мэтайаб'яднання жаданняў-патрэб зацікаўленых спажыўцоў і аб'яднання іх з мэтай дасягнення ўдалых вынікаў. Іншымі словамі, выдавецкі праект вымагае ад каардынатараў валодання кураташкімі здольнасцямі для паэтапнай працы з колам падтрымальнікаў праекта.

ЛІТАРАТУРА

1. Ганова М. Е. Издательский проект в современном отечественном книгоиздании: типология, особенности моделирования // Техносфера [Электронны рэсурс]. – 25.05.2015. – Код доступа: http://tekhnosfera.com/view/590557/a#?page=1. – Дата доступа: 17.04.2017.

УДК 655.512.3-053.4/.6:028.5

Студ. Воеводская О. Л.
Науч. рук. асс. Ковалевская Н. И.
(кафедра редакционно-издательских технологий, БГТУ)

## ПОРТРЕТ СОВРЕМЕННОГО ЧИТАТЕЛЯ СРЕДНЕГО И СТАРШЕГО ШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА

В наши дни проблемы грамотности, образования, культуры чтения, которые лежат в основе информационной культуры личности, становятся особенно значимыми и выходят на уровень проблем, от которых зависит благополучие нации. Понимание важности и ценности чтения мировым сообществом привело к тому, что сегодня во многих развитых и развивающихся странах осуществляется политика поддержки и продвижения чтения, в основе которой лежит поддержка чтения подрастающего поколения.

Детское чтение сегодня — область, где уже существует и продолжает накапливаться множество проблем. В последние годы произошло ухудшение целого ряда характеристик чтения у детей и подростков, снижение их уровня грамотности. Утрачивается не только культура чтения, но и культура речи, поскольку не осваивается значительная часть любимой когда-то литературной классики, составляющей ранее значительную часть репертуара чтения детей и подростков.

В последние десятилетия в Беларуси, так же как и во многих странах мира, продолжается процесс падения уровня читательской культуры населения.

В начале XXI в. дети действительно читают «не то» и «не так», как предыдущие поколения. Однако они, безусловно, читают, но иначе,